# ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ЦЯБЕ ЗАТРЫМАЛА МІЛІЦЫЯ

ПАМЯТКА ПАВОДЗІНАЎ ПРЫ АДМІНІСТРАТЫЎНЫМ ЗАТРЫМАННІ

* * *

У сакавіку 2007 г. уступіў у сілу новы Кодэкс Рэспублікі Беларусь пра адміністратыўныя правапарушэнні і Працэсуальна-выканаўчы Кодэкс Рэспублікі Беларусь пра адміністратыўныя правапарушэнні.

У сувязі з гэтым мы прапануем памятку паводзінаў пры адміністратыўным затрыманні паводле новага заканадаўства.

Першае, што трэба ведаць пры адміністратыўным затрыманні,- гэта тое, што паводле арт. 8.4 Працэсульна-выканаўчага кодэксу пра адміністратыўныя правапарушэнні (ПВКаАП) адміністратыўнае затры-маньне фізычнай асобы можа працягвацца **не больш за тры гадзіны.**

На тэрмін больш за тры гадзіны, **але не больш за 72 гадзіны**, могуць быць затрыманыя асобы, якія здзейснілі адміністратыўнае правапарушэнне, за якое ў якасьці спагнання прадугледжаныя адміністратыўны арышт ці дэпартацыя.

Тэрмін адміністратыўнага затрымання пачынаецца **з моманту фактычнага затрымання.** У выпадку затрымання на тэрмін большы за тры

гадзіны, паводле п. 4 арт. 8.4, такое затрыманне павінна афармляцца пратаколам.

Паводле арт. 8.5 пратакол пра адміністратыўнае затрыманне абвяшчаецца затрыманаму. Пры гэтым затрыманаму павінна быць растлумачанае ягонае права запрасіць адваката паводле п.5 ч.1 арт. 4.1 ПВКаАП.

На просьбу затрыманага на працягу трох гадзінаў прадстаўнікі органаў, якія ажыццяўлялі затрыманне, павінны паведаміць пра месца знаходжання затрыманага ягоным паўнагадовым членам сям'і, блізкім сваякам ці адвакату. Пра затрыманне непаўнагадовых, тымі хто затрымліваў, **абавязкова** павінна паведамляцца бацькам ці асобам, якія іх замяняюць.

## Патрабуйце, каб пра вашае месца знаходжання паведамілі вашым родным

Пры правядзенні асабістага вобыску памятайце, што ягонае правядзенне павінна адбывацца ў прысутнасці панятых. Пры такім вобыску павінны складацца пратакол альбо рабіцца адпаведны запіс у

пратаколе пра адміністратыўнае правапарушэнне ці затрыманне. Пры канфіскацыі рэчаў таксама патрабуйце складання пратаколу альбо адпаведнага запісу ў пратаколе пра адміністратыўнае правапарушэнне ці затрыманне, дзе былі б пералічаныя сканфіскаваныя рэчы.

Пасля адміністратыўнага затрымання і дастаўкі ў памяшканне РУУС пачынаецца адміністратыўны працэс. Пачынаецца ён са складання пратаколу пра адміністратыўнае правапарушэнне.

Падчас складання пратаколу пра адміністратыўнае правапарушэнне вас мусяць азнаёміць з вашымі правамі, пра што ў пратаколе робіцца адпаведная адзнака.

Паводле арт. 4.1 ПВКААП асоба, у дачыненні да якой вядзецца адміністратыўны працэс, мае наступныя правы:

- ведаць, здзяйсненне якога адміністратыўнага правапарушэння ёй ставіцца ў віну;
- даваць тлумачэнні ці адмовіцца ад давання тлумачэнняў;
- прадстаўляць доказы;
- заяўляць адводы і хадайніцтвы;

- мець абаронцу (адваката) ад пачатку адміністратыўнага працэсу, а ў выпадку адміністратыўнага затрымання – ад моманту абвяшчэння ёй пра адміністратыўнае затрыманне;
- безперашкодна размаўляць са сваім абаронцам (адвакатам) сам-насам і канфідэцыйна, спыніць паўнамоцтвы свайго абаронцы, адмовіцца ад абаронцы, бараніць сябе самастойна;
- карыстацца роднай мовай ці мовай, якой яна валодае, альбо паслугамі перакладчыка;
- пярэчыць супраць дзеянняў суддзі, асобы, якая вядзе адміністратыўны працэс, і патрабаваць унясення сваіх пярэчанняў у пратакол пра адміністратыўнае правапарушэнне ці ў пратакол працэсуальнага дзеяння;
- знаёміцца з пратаколам пра адміністратыўнае правапарушэнне, а таксама з матэрыяламі справы пра адміністратыўнае правапарушэнне пасля заканчэння падтрыхтоўкі яе да разгляду;
- удзельнічаць у разглядзе справы пра адміністратыўнае права-парушэнне;
- атрымліваць ад суду ці органу, які вядзе адміністратыўны працэс, копію

пастановы пра накладанне адміністратыўнага спагнання;

 падаваць скаргі на дзеянні суддзі, службовай асобы, якая вядзе адміністратыўны працэс, у тым ліку абскарджваць пастанову пра адміністратыўнае правапарушэнне.

Ад моманту Вашага затрымання і складання пратаколу пра адміністратыўнае правапарушэнне вы маеце права заяўляць хадайніцтвы.

1.Такім чынам, **першым вашым хадайніцтвам павінна быць хадайніцтва пра абаронцу (адваката).** Паводле арт. 2.3. ПВКААП суд ці орган, які вядзе адміністратыўны працэс, абавязаны забяспечыць абарону правоў, свабодаў і законных інтарэсаў удзельнікаў адміністратыўнага працэсу, стварыць устаноўленыя дзейным Кодэксам умовы для іх ажыццяўлення, своечасова прыймаць меры па задавальненні іхных законных патрабаванняў. **Такім чынам, Вашае права на абарону, гарантаванае арт. 62 Канстытуцыі РБ, павінна быць забяспечанае.**

2.Калі вы маеце намер даваць тлумачэнні па справе — памятайце,

што ўсе вашыя тлумачэнні мусяць быць дакладна адлюстраваныя **ў пратаколе апытання, які пасля заканчэння апытання мусіць быць прадстаўлены вам для прачытання.** Вы маеце права патрабаваць унясення ў гэты пратакол сваіх правак і дапаўненняў. Яны падлягаюць абавязковаму ўнясенню ў пратакол. Свае тлумачэнні вы можаце выкласці асабіста ў пісьмовым выглядзе. Калі вы мяркуеце, што па справе неабходна апытаць сведкаў, вы можаце заявіць пра гэта адпаведнае хадайніцтва (лепей пісьмова).

3. Пасля заканчэння падрыхтоўкі матэрыялаў адміністратыўнай справы вы маеце права азнаёміцца з усімі матэрыяламі**. Памятайце, што вам мусяць выдаць копію пратаколу пра адміністратыўнае правапарушэнне.**

**Такім чынам, памятайце, што вас мусяць азнаёміць з усімі матэрыяламі справы (пратаколамі адміністратыўнага затрымання, пратаколам апытання, іншымі пісьмовымі матэрыяламі справы), азнаёміць і выдаць на рукі копію пратаколу пра адміністратыўнае правапарушэнне.**

4. Пастанову пра адміністратыўнае правапарушэнне і накладзенае адміністратыўнае спагнанне вы маеце права абскардзіць у вышэйстаячы суд ці ў пракуратуру. Падача скаргі ў дзесяцідзённы тэрмін прыпыняе выкананне пастановы (за выключэннем адміністратыўнага арышту і дэпартацыі, якія выконваюцца неадкладна ад моманту вынясення пастановы) да разгляду скаргі вышэйстаячым судом. Таксама вы маеце права абскардзіць у органы пракуратуры і суд любыя незаконныя дзеянні супрацоўнікаў міліцыі.

УЗОР СКАРГІ
Ў ПРАКУРАТУРУ

У пракуратуру_________________
*(раёну, гораду, раёну ў горадзе)*

*ад*___________________________
*(прозвішча, імя, імя па бацьку)*

*які пражывае*_________________
*(хатні адрэс)*

Скарга
на дзеянні супрацоўнікаў міліцыі

*(Дата падзеі)* ___________________
_________________________________

*(сутнасць таго, што з вамі адбылося і ў чым палягаюць незаконныя дзеянні супрацоўнікаў міліцыі, ужытыя супраць вас)*

Сведкамі незаконных дзеянняў міліцыі былі:____________________
*(указаць прозвішчы і хатнія адрэсы сведкаў)*

На падставе вышэйсказанага мяркую, што сваімі дзеяннямі супрацоўнікі міліцыі перавысілі свае службовыя паўнамоцтвы, парушылі мае законныя правы. У выніку іхных незаконных дзеянняў я атрымаў маральныя (фізычныя, калі мелі месца) пакуты.

У сувязі з гэтым, кіруючыся ч. 3 арт. 6 Закону Рэспублікі Беларусь “Пра органы унутраных спраў”, Законам Рэспублікі Беларусь “Аб пракуратуры” я прашу:

1. Правесці праверку ўказаных мною фактаў.
2. Прыцягнуць вінаватых да вызначанай законам адказнасці.
3. Пісьмова праінфармаваць мяне пра вынікі праведзенай праверкі і

азнаёміць мяне з яе вынікамі.

Дата____________

Подпіс___________

## Што рабіць, калі вас хочуць схіліць да супрацоўніцтва з КГБ

Выклік у дэканат, размова з невядомымі, але абазнанымі ў вашым прыватным жыцці дзядзькамі, прапанова даць інфармацыю ў абмен на вырашэнне праблемаў з вучобай, просьба нікому не казаць пра размову, прапанова падпісаць пагадненне пра супрацоўніцтва... У апошні час даводзілася неаднаразова выслухоўваць падобныя гісторыі ад моладзі: хлопцаў і дзяўчат, студэнтаў і нестудэнтаў. Як вы ўжо здагадаліся, гаворка ідзе пра КГБ.

На падставе гэтых шматлікіх аповядаў складаецца пэўнае ўяўленне пра сістэму працы “чэкістаў” з моладдзю, іх падыходаў, якія, варта адзначыць, у большасці выпадкаў з’яўляюцца аднатыпнымі. У гэтых

нататках мы паспрабуем даць парады, як варта сябе паводзіць пры навязлівых і непажаданых для вас сустрэчах з прадстаўнікамі гэтага ведамства. Паспрабуем змадуляваць падобную сітуацыю:

Як паказвае практыка такога кшталту, кантакты адбываюцца звычайна ў месцы вучобы – ва ўніверсітэце, коледжы ці вучэльні. Студэнта, інфармацыя пра грамадска-палітычную дзейнасць якога ўжо патрапіла ў поле зроку КГБ (раней затрымліваўся ў “нехарошых” кампаніях, ці падчас несанкцыянаваных акцыяў, за распаўсюд друкаваных матэрыялаў і г.д.), выклікаюць у дэканат, каб паразмаўляць з ім пра пытанні, датычныя навучальнага працэсу. Калі студэнт прыходзіць у дэканат, там (дэкан ці ягоны намеснік) паведамляюць яму пра тое, што з ім хочуць паразмаўляць двое, альбо адзін “таварыш”. Сам дэкан звычайна пры далейшай сустрэчы не прысутнічае. Вось тут і пачынаецца самае цікавае. Дзядзька прадстаў-ляецца якім-небудзь Іванам Сярге-евічам і, між іншага, намякае вам: маўляў, спадзяюся, што вы

разумееце, з якой я “арганізацыі”, альбо адкрыта паведамляе, што ён з КГБ.

Далей “харошы дзядзька” паспрабуе паказаць вам сваю абазнанасць у вашым прыватным жыцці. Распавесці, што бачыў вас у кампаніі “кепскіх” хлопцаў з Маладога Фронту ці Моладзі БНФ, а таксама, што яму ўсё вядома пра вашую апошнюю паездку ў Польшчу, Літву ці Украіну. Або пра іншыя факты з вашага жыцця. Мэта гэтых дзеянняў – паказаць вам, што ўсёбачнае вока КГБ сочыць за вамі і ўдзень і ўначы, і “кантора” ведае пра вас усё. Іх цікавіць найперш вашая псіхалагічная рэакцыя на пачутае. І калі вы сумеліся, напалохаліся ці нярвуецеся – гэта тое, што трэба, цяпер “дзядзьку” можна паступова падыходзіць да наступнай часткі размовы. Далей ён скажа вам, што яго вельмі цікавіць інфармацыя пра дзейнасць вядомых вам асобаў, моладзевай групы і г.д. Затым вам паабяцаюць паспрыяць вырашэнню ўсіх вашых праблемаў у навучальнай установе (здачы “хвастоў” на сесіях, добрае размеркаванне, вырашэнне праблемаў з войскам і г.д.), ці

ўлагодзіць нейкую іншую праблему. Далей дзядзька дасць вам нумар ягонага мабільнага тэлефону і час на роздум. Праз некалькі дзён ён паабяцае вярнуцца да размовы пры наступнай сустрэчы. А на развітанне дзядзька папросіць вас нікому не казаць пра вашую з ім размову: гэта ж канфідэцыйна, вы ж дарослы і ўсё разумееце…

Дык што ж рабіць? Вы ў разгубленасці, вамі авалодаў страх. Настойліва раім вам — не палохайцеся і ні ў якім выпадку не паказвайце ім, што вы нярвуецеся. Нечаканасць першай сустрэчы – пачатак далейшага стандартнага метаду працы з вамі супрацоўнікаў КГБ. Спачатку паспрабуем разабраць тое, што трэба было адразу зрабіць пры размове з імі:

Напачатку размовы папрасіце невядомага вам Івана Сяргеевіча прадставіцца і прад'явіць вам службовае пасведчанне. Абавязкова запомніце, а лепей не спяшайцеся і запішыце ягонае прозвішча. Пры адмове з ягонага боку прадставіцца паведамце невядомаму, што працягу вашай размовы не будзе, паколькі з невядомымі вам асобамі вы не

размаўляеце. Разварочвайцеся і смела вяртайцеся ў аудыторыю (ці іншае месца, куды вы збіраліся па сваіх справах). Калі ён усё ж прад'явіць вам сваё службовае пасведачанне – пацікаўцеся, што яму ад вас патрэбна і чаму б яму (ім) не выклікаць вас афіцыйна – праз позву (павестку). ¨н, вядома, можа сказаць, што яму трэба ўзяць у вас тлумачэнні, альбо нават паказанні сведкі па нейкай справе, праблеме ці выпадку (паездцы за мяжу на канферэнцыю, ці моладзевай сустрэчы, ці нейкай сустрэчы дэмакратычных актывістаў у Беларусі, ці распавесці пра нейкага вашага знаёмага ці нешта яшчэ). У дадзенай сітуацыі, зноўку ж, абавязкова патрабуйце выклікаць вас афіцыйна позвай, у якой будзе ўказана, хто, куды, і ў якасці каго вас будзе выклікаць. Скажыце, што прыйдзеце не адзін, а з адвакатам, паколькі арт. 62 Канстытуцыі гарантуе грамадзянам краіны юрыдычную дапамогу (гэта на выпадак, калі ён пачне вам распавядаць пра тое, што сведкам і для дачы тлумачэнняў адвакат “не палагаецца”). Калі ж ён пачне задаваць канкрэтныя пытанні і будзе настойваць на дачы вамі тлумачэнняў па гэтых

пытаннях – не губляйцеся і нагадайце дзядзьку, што **вы маеце права не даваць ніякіх тлумачэнняў!**

Калі вас усё ж такі афіцыйна выклікалі ў КГБ позвай для дачы тлумачэнняў, раім вам з’явіцца на выклік, але катэгарычна адмовіцца ад дачы якіх-небудзь тлумачэньняў. Таксама настойліва раім вам не падпісваць і не запаўняць ніякія паперы, анкеты, пратаколы і г.д. Заўсёды памятайце, што адмова ад дачы тлумачэнняў — вашае законнае права! Адмова ад дачы тлумачэнняў не цягне за сабой ніякіх юрыдычных наступстваў.

Пасля размовы адразу ж паведамце пра гэтую сустрэчу незалежным сродкам масавай інфармацыі і праваабаронцам. Гэта важна зрабіць, паколькі пасля гэтага далейшыя сустрэчы з “таварышамі”, як правіла, не адбываюцца. Каму ж патрэбны “інфарматар”, пра кантакты якога з КГБ усім вядома? Калі ж вам усё ж такі прапанавалі супрацоўнічаць, паабяцаўшы вырашыць нейкія вашыя праблемы з вучобай, размеркаваньнем і г.д., памятайце, што паводле арт. 22

Закону Рэспублікі Беларусь “Пра органы дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь” ад 3 снежня 1997 г., супрацоўніцтва з органамі мае выключна дабраахвотны характар. Гэта значыць – з вашае згоды. Таму ўсялякія пагрозы “таварышаў” за адмову ад супрацоўніцтва будуць мець незаконны характар. Калі ж яны былі – звяртайцеся са скаргай у пракуратуру і абавязкова надавайце такім фактам публічны характар.

Але вам могуць паведаміць, што вас выклікаюць у якасьці **сведкі**. Што тычыцца допыта сведкі, дык гэта працэсуальнае дзеянне, якое рэгулюецца нормамі Крымінальнага Працэсуальнага Кодэксу . Сведка дапытваецца па канкрэтнай узбуджанай крымінальнай справе. Паводле арт. 215 КПК РБ допыт адбываецца ў месцы правядзення папярэдняга следства. Следчы, дазнавальнік, маюць права, калі ўважаць гэта за неабходнае, правесці допыт у месцы знаходжання асобы, якая дапытваецца.

Паводле арт. 216 КПК, сведкі выклікаюцца на допыт позвай, дзе

мусіць быць указана, хто і ў якасьці каго выклікаецца, дата і гадзіна з'яўлення на допыт, адрэс, куды вас выклікаюць. Позва ўручаецца пад роспіс асобе, якая выклікаецца. Пры адстутнасці гэтай асобы позва ўручаецца пад роспіс каму-небудзь з паўнагадовых членаў сям'і альбо адміністрацыі па месцы працы, якія абавязаныя перадаць позву асобе, выкліканай на допыт.

Такім чынам, першае, што трэба зрабіць, калі вас вусна выклікаюць на допыт у якасьці сведкі, гэта запатрабаваць афіцыйнага выкліку вас на допыт – праз позву. У любым выпадку паспрабуйце звесці вашую размову да мінімуму і дайце выразна зразумець, што размаўляць з імі ў вас няма ніякага жадання. І не забывайцеся пра магчымасць скарыстацца з адвакацкіх паслугаў.

Другім важным аспектам з'яўляецца тое, што перад пачаткам допыту следчы павінны, паводле арт. 217 КПК РБ, паведаміць асобе, якую выклікалі на допыт, па якой крымінальнай справе яна будзе дапытаная, растлумачыць правы і абавязкі, прадугледжаныя

артыкуламі КПК, у тым ліку і **права адмовіцца ад дачы паказанняў у адносінах да яе самой, членаў яе сям'і і блізкіх сваякоў.** Асоба, выкліканая на допыт у якасьці сьведкі, папярэджваецца пра крымінальную адказнасць за ўхіленне альбо адмову ад дачы паказанняў і за дачу загадзя няпраўдзівых паказанняў.

Памятайце, што ўвесь ваш допыт мусіць фіксавацца ў пратаколе допыту, з якім, па яго завяршэнні, вас абавязаныя азнаёміць. Патрабуйце вядзення пратаколу допыту, адмаўляйцеся размаўляць са следчым "з воку на вока", без пратаколу. Калі вы ўспрымаеце пытанні, якія задае вам следчы, як скіраваныя супраць вас, адмаўляйцеся адказваць на іх, матывуючы сваю адмову гарантаваным вам арт. 27 Канстытуцыі правам не даваць паказанні супраць сябе самога.

І напрыканцы яшчэ некалькі парадаў. Паспрабуйце мінімізаваць колькасць вашых сустрэчаў з прадстаўнікамі КГБ. Памятайце, чым менш вы з імі сустракаецеся, тым лепей для вас. Не падпісвайце ні ў якім

выпадку кантрактаў і пагадненняў пра супрацоўніцтва з КГБ. Калі ж вас змусілі падпісаць нейкія паперы, памятайце, што супрацоўніцтва ажыццяўляецца толькі з вашай згоды, а не пад прымусам.

*Паводле сайту*
*www.spring96.org*